3. Трафімчык, А. Сучасная беларуская рэалістычная драматургія для дзяцей і моладзі / А. Трафімчык // Адлюстраванне сучаснай Беларусі ў мастацкай літаратуры: зборнік навуковых артыкулаў. – Мн.: Беларуская навука, 2020. – С. 39–51.

## ВЫКАРЫСТАННЕ ФРАЗЕАЛАГІЗМАЎ У МЕДЫЦЫНЕ

**Рамэйка Т. І.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – *Сняжыцкая А. С.*

Быць цікаўным – адна з самых галоўных рыс чалавека з самых даўніх часоў. Трапнай, ёмкай і зразумелай характарыстыкай самых розных працэсаў, здарэнняў, характараў, знешнасцей і шматлікіх іншых рэчаў сталі фразеалагізмы. Людзі заўсёды падмячалі пры дапамозе фразіялагізмаў фізічны і псіхічны стан чалавека. Шмат з такіх выказванняў не ўстарэлі і сёння. Студэнтам-медыкам знаёмства з такімі фразеалагізмамі дапамагае лепш засвоіць прафесійную лексіку беларускай мовы. Пры некаторай карэкцыі іх могуць выкарыстоўваць урачы ў сваёй прафесійнай дзейнасці з мэтай наладжвання камунікацыі з пацыентамі. Прывядзем прыклад такіх трапных выказванняў.

*Фразеалагізмы пра смерць*: трапіць да Абрама на піва; ногі працягнуць; аддаваць Богу душу; адкідваць канькі (капыты); адправіцца на той свет; адысці з гэтага свету; адысці ў вечнасць (лепшы свет, у вырай); ажаніцца з сырой зямлёй; выпростваць ногі; дух выпусціць; аддаваць канцы; даваць дуба; дух вон; Бог прыбраў; знайсці сабе магілу; спаць у сырой зямлі.

*Фразеалагізмы пра агонію*: адной нагой стаяць у магіле; глядзець смерці ў вочы (твар); дні злічаны; дыхаць на ладан; зямлёй пахнуць; не жылец (на гэтым (белым) свеце); паміж жыццем і смерцю; на Божай пасцелі; жывы нябожчык; на божай (смяротнай) пасцелі; зямлёй пахнуць; песенька спета; на паповы сані збірацца; складваць рукі; жывы труп.

*Фразеалагізмы пра слабасць*: хістацца ад ветру; ад ветру валіцца; выбівацца з сіл; ледзь душа ў целе; як з крыжа зняты; ногі не носяць; ногі не трымаюць; парахня сыплецца; пясок сыплецца; ледзь трымацца на нагах; хоць у дамавіну кладзі; ледзь ногі цягаць ( цягнуць, валачы); ледзь шоры цягаць.

*Фразелагізмы пра гіперактыўнасць*: адарві ды падай.

*Фразеалагізмы пра блізнят*: на адзін твар; як дзве кроплі вады.

*Фразеалагізмы пра анарэксію*: адна скура ды косці; адны вочы засталіся; барабаніць касцьмі; жывот да спіны (да хрыбетніка, да паясніцы) прырос (прысох,прыліп); з’ехаць на мыла; скура ды арматура.

*Фразеалагізмы пра бяссонне*: ні ў адным воку.

*Фразеалагізмы пра алкагольны дэлірый*: адпіць мазгі; пабачыць шклянога Бога.



Репозиторий ГрГМУ

*Фразеалагізмы пра карлікавасць*: ад зямлі не адрос; кату па пяту; аршын з шапкай; жабе па калена; з вузел; ад гаршка паўвяршка.

*Фразеалагізмы пра кагнітыўныя парушэнні*: апускацца на дно; выжываць з розуму; дах едзе; ісці па крывой дарожцы; каціцца ўніз; з'язджаць з глузду; крануцца з розуму; мазгі адсохлі; зрух па фазе; блёкату наеўся.

*Фразеалагізмы пра дэпрэсію*: апускаць вушы ( галаву, крылы, рукі, нос); як у ваду апушчаны; занепадаць духам.

*Фразеалагізмы пра пакуты*: не бачыць света белага.

*Фразеалагізмы пра смагу*: брахаць на ваду.

*Фразеалагізмы пра санлівасць*: вочы зліпаюцца.

*Фразеалагізмы пра хваробу*: выбыць са строю.

*Фразеалагізмы пра алкагалізм*: лыка не вяжа; пад градусам; на брывах; на вушах; на падпітку; на ўзводзе; пад мухай; пад хмяльком; пад газам; пад чаркай; пад шафэ; заліваць за гальштук; заліваць вочы; вадзіць казу; заліваць чарвяка; мокнуць у гарэлцы; наступіць на корак; не прасыхаць; браць у губу.

*Фразеалагізмы пра стэнакардыю*: грудная жаба.

*Фразеалагізмы пра сацыяльную дэзадаптацыю*: замыкацца ў сваёй шкарлупіне; замыкацца ў сабе; замыкацца ў сваю ракавіну.

*Фразеалагізмы пра выдатнае здароўе*: хоць у плуг запрагай; кроў з малаком; кроў гарыць.

*Фразеалагізмы пра выздараўленне*: як рукой зняло; вярнуцца ў строй; падняцца (стаць) на ногі.

*Фразеалагізмы пра нараджэнне*: з'яўленне (прыход) на свет.

*Фразеалагізмы пра немату*: як вады ў рот набраў; як язык праглынуў.

*Фразеалагізмы пра блізарукасць*: нізкі на вочы.

*Фразеалагізмы пра атлусценне*: плячысты на жывот.

*Фразеалагізмы пра дрэннае самаадчуванне*: свет пераварочваецца; у вачах цямнее; галава закружылася; кругі ў вачах плывуць.

*Фразеалагізмы пра цяжарнасць*: у цікавым становішчы; ветрам надзьмула.

*Фразеалагізмы пра праблемы са слыхам*: тугі на вуха; глухі цецярук; глухая цяцера.

*Фразеалагізмы пра слабасць*: хістацца ад ветру; ад ветру валіцца; выбівацца з сіл; ледзь душа ў целе; як з крыжа зняты; ногі не носяць; ногі не трымаюць; парахня сыплецца; пясок сыплецца; ледзь трымацца на нагах; хоць у дамавіну кладзі; ледзь ногі цягаць (цягнуць, валачы); ледзь шоры цягаць.

Літаратура:


1. Лепешаў, І.Я. Слоўнік фразеалагізмаў беларускай мовы. Том 1. А-Л – URL: https://www.twirpx.com/file/1492639/ (дата звароту: 15.09.2025).

2. Лепешаў, І.Я. Слоўнік фразеалагізмаў беларускай мовы. Том 2. М-Я – URL: https://www.twirpx.com/file/949465/ (дата звароту: 26.09.2025).

3. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў [Іван Якаўлевіч Лепешаў] – URL: https://pda.coollib.in/b/302861-ivan-yakawlevich-lepeshaw-etyimalagichnyi-slownik-frazealagizmaw/read (дата звароту: 10.09.2025).




Репозиторий ГрГМУ